Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суд аштрафаваў журналістаў Наталлю Крывашэй і Кастуся Жукоўскага

09.07.2015 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода слова



Як паведамляе "Беларуская асацыяцыя журналістаў", суддзя Рагачоўскага раённага суду **Аляксандр Крайнікаў** прызнаў гомельскіх журналістаў-фрылансераў **Кастуся Жукоўскага** і **Наталлю Крывашэй** вінаватымі ў незаконным вырабе прадукцыі СМІ для спадарожнікавага тэлеканалу "Белсат". Яны аштрафаваныя паводле ч. 2 арт. 22.9 КаАП – кожны на 35 базавых велічыняў (па 6 млн 300 тысяч рублёў).



СВЕДЕНИЯ ОБ АДМИНИСТРАТИВНОМ ПРАВОНАРУШЕНИИ

Жуковский Константин Иосифович 12 мая 2015 года около 19-00 часов на площадке около магазина «Продмикс» по ул. Богатырева в г. Рогачеве Гомельской области не имея аккредитации в Республике Беларусь в качестве журналиста иностранного СМИ, в группе с Кривошей Наталией Николаевной проводил интервьюирование граждан, тем самым незаконно изготовил продукцию средств массовой информации, а именно видеосюжет под названием: «Несалодкі смак крызісу. Чаму рагачоўская згушчонка застаецца на складах?», который 14 мая 2015 года был продемонстрирован в эфире спутникового телеканала «БелСат» р. Польша в программе «Объектив», а также впоследствии был размещен на официальном сайте данного телеканала (http://belsat.eu/be/programs/abjektyu/2015-05-14/nesalodki-smak-kryzisu-chamu-ragachoskaya-zgushchonka-zastaecca-na-skladah), тем самым нарушил законодательство о средствах массовой информации, а именно требования ч.4 ст. 35 Закона Республики Беларусь 17 июля 2008 г. № 427-З «О средствах массовой информации».

Падставай для штрафу сталіся адміністрацыйныя пратаколы – іх склаў начальнік аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Рагачоўскага РАУС, падпалкоўнік міліцыі **Юрый Астаповіч**.

У пратаколе, у прыватнасці, гаворыцца: “12 мая на пляцоўцы каля магазіна “Прадмікс” па вуліцы Багатырова ў г. Рагачове, не маючы акрэдытацыі ў Рэспубліцы Беларусь у якасці журналіста замежнага СМІ, Кастусь Жукоўскі ў групе з Наталляй Крывашэй праводзіў інтэрв’юіраванне грамадзянаў, тым самым незаконна вырабіў прадукцыю сродкаў масавай інфармацыі, а менавіта відэасюжэт пад назвай “Несалодкі смак крызісу. Чаму рагачоўская згушчонка застаецца на складах?”... Відэасюжэт быў паказаны 14 траўня “на тэлеканале “БелСат” р. Польшча” *(так пазначана ў пратаколе)* у праграме “Аб’ектыў”, а пасля змешчаны на афіцыйным сайце канала. Гэтым нібыта і парушана “патрабаванне ч. 4 арт. 35 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб сродках масавай інфармацыі””.

На судзе, які адбыўся 2 ліпеня, ані Жукоўскі, ані Крывашэй не прысутнічалі. Позвы яны не атрымалі. Як патлумачыў суддзя Крайнікаў службе маніторынгу ГА “БАЖ”, паводле інструкцыі па справаводстве, суд нібыта мае права паведамляць пра паседжанні з дапамогай SMS-паведамленняў.

> “Нечага іншага, апрача штрафаў, чакаць ад судоў не выпадае, – каментуе рашэнне Наталля Крывашэй. – У краіне крызіс. І спецслужбы, і міліцыя разам з судамі знайшлі адносна лёгкі спосаб папаўнення бюджэту – праз грамадскіх актывістаў і журналістаў-фрылансераў”.

Спадарыня Крывашэй заўважыла таксама, што ч. 4 артыкула 35 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб сродках масавай інфармацыі” тычыцца прафесійнай дзейнасці журналістаў замежных СМІ без акрэдытацыі ў Беларусі. Але яна не з’яўляецца штатным журналістам-замежнікам, бо не мае працоўнай дамовы ні з “Белсатам”, ні з кім-кольвек яшчэ. Яна як грамадзянка Беларусі часам збірае і распаўсюджвае інфармацыю – такое права ёй гарантуе Канстытуцыя і Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, які ратыфікавала беларуская дзяржава.

Для Наталлі Крывашэй сёлета гэты быў чацвёрты суд па аналагічных адміністрацыйных справах, а Кастуся Жукоўскага судзілі ўжо ў сёмы раз (шэсць судоў тычыліся арт. 22.9 ч.2 КаАП, адзін – арт. 23.34 КаАП). Агулам Наталлі трэба сплаціць у бюдждэт 24,3 млн рублёў, а Кастусю – 31,5 млн рублёў.

Усяго ў Беларусі сёлета суды ўжо 24 разы штрафавалі журналістаў-фрылансераў паводле арт. 22.9 КаАП. Сума штрафаў перавысіла 129 мільёнаў рублёў.

Днямі Праўленне ГА “БАЖ” зрабіла заяву, у якой гаворыцца, што “міліцыя і суды насуперак Закону "Аб СМІ" распаўсюджваюць абавязак атрымання акрэдытацыі ў МЗС на журналістаў-фрылансераў, якія не з'яўляюцца штатнымі супрацоўнікамі замежных СМІ. А затым неабгрунтавана прыраўноўваюць дзейнасць без акрэдытацыі да парушэння парадку вырабу і распаўсюду прадукцыі СМІ”.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY